*УДК 94(4)+284-1(44)*

# СТРУКТУРА АБШЧЫНЫ ЕРЭТЫКОЎ-ВАЛЬДЭНСАЎ АД ПАЧАТКУ ІСНАВАННЯ ДА КАНЦА XIV СТАГОДДЗЯ

**А. В. Валодзіна**

*Варшаўскі ўніверсітэт,*
*пр. Незалежнасці 227/233 02-087 Варшава, Польшча*
*a.v.valodzina@gmail.com*

На першым этапе вальдэнская абшчына дзялілася на дзве часткі: вандроўныя прапаведнікі і аселыя вернікі. Першыя жылі з міласціны, якую падавалі ім другія. Такі падзел быў тыповы для ўсіх рухаў апостальскай беднасці. Галоўнымі абавязкамі прапаведнікаў былі: пропаведзь, навучанне, прыманне споведзяў і благаслаўленне ежы. Вернікі маглі не падазраваць пра сваю «ерэтычнасць» і вярталіся ў лона каталіцкай царквы. Для інквізітараў асноўную небяспеку прадстаўлялі члены першай групы, таму часцей за ўсё толькі іх і называлі «вальдэнсамі». Паступова структура ўскладнялася, прапаведнікі падзяліліся мінімум на дзве часткі: апосталаў і братоў. Узнікае савет абшчыны (усеагульны сінод). Нават пасля смерці заснавальніка руху Вальдо выбіраўся адзіны лідар руху. Ствараюцца гаспіцыі, на чале якіх стаяць рэктары (з прапаведнікаў). Сярод аселых вернікаў у месцах пражывання вялікіх груп таксама вылучаюцца свае старшыні і/або скарбнікі, чыя прыналежнасць да святароў на дадзены момант не ўстаноўлена.

**Ключавыя словы**: вальдэнсы; ерасі; ерэтычныя рухі; рэлігійныя абшчыны; рэлігійныя рухі; Сярэднявечча; Сярэднявечная Еўропа.

# THE STRUCTURE OF THE COMMUNITY OF WALDENSIAN HERETICS FROM THE BEGINNING OF ITS EXISTENCE TO THE END OF THE XIV CENTURY

**A. Valodzina**

*University of Warsaw*
*Al.Niepodległości 227/233 02-087 Warszawa, Poland*
*a.v.valodzina@gmail.com*

At the first stage, the Waldensian community was divided into two parts: itinerant preachers and settled believers. The former lived on alms given to them by the latter. Such a division was typical of all movements of apostolic poverty. The chief duties of the preachers were preaching, teaching, taking confessions and blessing food. Believers may have been unaware of their «hereticism» and return to the fold of Catholic Church. For the inquisitors, the main danger was represented by the members of the first group, so most often only they were called «Waldenses». Gradually the structure became more complicated, the preachers split into at least two groups: i.e. the apostles and the brethren. A community council (general synod) was established. Even after the death of the founder of the movement, Waldo, a sole leader of the movement would be elected. Hospices were set up, with rectors (from among preachers) as their heads. Wherever they were present in large groups, the settled believers would also nominate their elders and / or treasurers, whose affiliation to the priests is not currently established.

**Keywords**: Waldenses; heresy; heretical movements; religious communities; religious movements; The Middle Ages; Medieval Europe.

***Уводзіны***

Першасны падзел вальдэнскага руху, які ўзнік на поўдні Францыі ў 70-ых гг. XII ст., адпавядаў пашыранай у тыя часы схеме падзелу ўсіх вандроўных ерэтычных рухаў апостальскай беднасці. Такая структура назіралася ва ўсіх рэгіёнах распаўсюджання руху ў абазначаны перыяд [1, с. 21]. Карані яе можна назіраць у Патарыі XI ст.: клерыкальнае ядро ў цэнтры і шырокае кола звычайных вернікаў; пашырэнне праз пропаведзь з апорай на пісьмовы тэкст [2, p. 235]. Яшчэ пры жыцці свайго заснавальніка (Вальдо, канец XII ст.) секта падзялілася на вандроўных (бо «той, хто вандруе, бліжэй да Бога» [3, p. 24]) магістраў/дасканалых (яшчэ сустракаюцца назвы «ўладар» (dominus), «спаведнік» (confessor), «прапаведнік» (predicator), «ерэсіярх» (heresiarchus) і інш.) і «вернікаў, якія маюць маёмасць і бяруць шлюб, гандлююць, вядуць справы, набываюць і атрымліваюць прыбытак для сваіх ерэтыкоў-дасканалых, якія іх наведваюць, прапаведуюць і ратуюць, карыстаючыся даверлівасцю, якую ніжэйшыя да іх маюць» [4, p. 196]. Іншыя крыніцы, напрыклад, Рэскрыпт, называюць магістраў «братамі і сёстрамі», а вернікаў – «сябрамі і сяброўкамі» [6, S. 42]. Падобнае чляненне ўсіх паслядоўнікаў руху на тых, хто вядзе свецкае жыццё, і на тых, хто вядзе духоўнае, назіраецца як у альбігойцаў, так і ў францысканцаў.

***Знешнія прыкметы першай групы***

«Гэтых дасканалых ерэтыкоў адных называюць “абутымі ў сандалі” (sandaliati), а іншых – “новенькімі” (novellani)», – піша аўтар трактата «Devita» пра «ступені» магістраў [4, p. 196]. Пётр з Во-дэ-Цэрн (першая чвэрць XIII ст.) сцвярджае, што першую назву яны атрымалі з-за прагі да «выказвання сваёй выключнасці ў нашэнні сандаляў па прыкладзе апосталаў» [7, с. 168; 8, p. 240–241]. Такім чынам, мы бачым, што размежаванне паміж дзвюма групамі магло знаходзіць адлюстраванне і ў знешнасці: «таму што калісьці ад самага пачатку вальдэнскія дасканалыя паказвалі спецыяльны знак, як быццам бы зразаючы верхнюю частку абутку, і гэтым знакам яны ад іншых сваіх паплечнікаў (complicibus) адрозніваліся», – піша знакаміты Бернард Гі ў сваім падручніку для інквізітараў (1323 г.) [9, p. 245]. «Таксама абутыя ў сандалі сярод іх, якія называюцца святарамі, носяць адну даўгую туніку і ходзяць босымі або абутымі ў адкрытыя зверху сандалі» [10, p. 142]. Такім чынам, спецыфічны абутак (сандалі) становіцца адрознай прыкметай вандроўных вальдэнскіх прапаведнікаў нароўні з арыентацыяй на Пісанне («вернік ерэтыкоў-вальдэнсаў і сябра… у сваім

доме былі… многія схаваныя ерэтыкі з кнігамі і сандалямі» (XIII ст.) [5, S. 59–62]) і нават дае альтэрнатыўную назву ўсяму руху: «вышэйадзначаныя вальдэнсы, або сандаліаты (абутыя ў сандалі – А.В.), якія самі сябе называюць іншым імем – бедныя з Ліёна» (1192 г.) [6]. Гэта невыпадкова, бо пытанне вопраткі і прычоскі было пытаннем статусу ў Сярэднявеччы. Нашэнне вальдэнсамі сандаляў у вачах каталіцкіх іерархаў было спробай адмовіць царкве ў праве выратавання хрысціянаў [11, p. 357]. Да сярэдзіны XIV ст. вальдэнскія «святары» дэманстравалі свой статус амаль адкрыта (праз абутак), далей, у сувязі з узмацненнем інквізіцыйнага вышуку, згадкі пра асаблівы абутак або вопратку знікаюць з крыніц.

***Абавязкі розных групаў***

Розныя групы маюць розныя абавязкі: першыя «не працуюць, нічога не набываюць і не атрымліваюць прыбытку, на які маглі б выжываць, але на даброты і міласціну сваіх сяброў і вернікаў існуюць і жывуць, шчыра клапоцячыся пра навучанне. А іх сябры і вернікі маюць маёмасць і бяруць шлюб, гандлююць, вядуць справы, набываюць і атрымліваюць прыбытак для сваіх ерэтыкоў-дасканалых, якія іх наведваюць, прапаведуюць і ратуюць», – тлумачыць складальнік «De vita» [4, p. 196]. У інквізітарскіх матэрыялах XIII ст. удакладняецца: вернікі «часта наведваліся вальдэнсамі, слухалі іх пропаведзі, прымалі іх ці рабілі ім іншыя паслугі, і прымалі ад іх пацалунак міру» [5, S. 50–54]; «быў пад уплывам ерэтыкоў-вальдэнсаў на працягу сарака гадоў, наведваўся імі і грошы і іншае ім аддаваў» [5, S. 55–56]; «вернік ерэтыкоў-вальдэнсаў і сябра… у сваім доме былі… многія схаваныя ерэтыкі з кнігамі і сандалямі… многія і многія разы прымала, ведаючы, што гэта ерэтыкі-вальдэнсы, ела з імі хлеб, блаславлёны вальдэнсамі, за Вячэрай Господняй у доме тваім, і слухала іх гібельныя нагаворы» [5, S. 59–62]. Колькасць тэрцыярскіх арганізацый імкліва расце акурат у часы Інакенція III [12, p. 367], і вальдэнскія «вернікі» цалкам упісваюцца ў гэты шаблон.

Праўда, цвёрдасць такіх «вернікаў» была слабая, бо падчас інквізіцыйных працэсаў яны часта раскайваліся, бо верылі, што «вальдэнсы – добрыя людзі і сябры Бога, і ў стане выратавацца, і гэтаму выратаванню вучаць іншых, калі хто хацеў далучыцца да іх, і ты прымала іх па той прычыне, што верыла, што яны – добрыя людзі» [5, S. 59–62]. Калі ж высвятлялася, што гэтыя «добрыя людзі» адлучаныя ад царквы, – многія вернікі ад іх адварочваліся. У абсалютнай большасці інквізіцыйных матэрыялаў «вальдэнсамі» (або іншымі сінонімамі руху) называлі толькі прадстаўнікоў першай групы [13, p. 52].

Падсумоўваючы сказанае вышэй, абавязкі «магістраў» складаліся з:

1. Пропаведзі (галоўная тэза на першым этапе развіцця руху; з узмацненнем інквізіцыйнага пераследу публічная пропаведзь знікае, саступаючы месца наступнаму абавязку);

2. Навучання (у шматлікіх крыніцах згадваюцца вальдэнскія «школы», але «праграма» іх застаецца невядомай: дакладна практыкавалася завучванне вытрымак з Бібліі на памяць, магчыма – чытанне і пісьмо. Наконт астатняга вядуцца спрэчкі. Прынамсі, пры пераходзе ў першую групу ўзровень адукацыі не правяраўся [14, p. 129]);

3. Прыняцця споведзі і адпускання грахоў. «Свае грахі спавядалі вальдэнсам, як павінны былі спавядаць святарам» [5, S. 50–54];

4. Бласлаўлення віна, хлеба і рыбы, правядзення Святой Вячэры «ужывалі хлеб і рыбу ў дні вячэры згодна з праклятым сваім звычаем па бласлаўленню вальдэнсаў … бо верылі, што вальдэнсы так асвячаюць Цела Гасподне» [5, S. 50–54].

***Кіраўніцтва асобнымі абшчынамі і ўсім рухам***

Складванне сістэмы кіраўніцтва адбываецца пасля смерці Вальдо, які быў рашуча супраць. Сістэма была выбарнай: «выбіраюць разам пажыццёвых старшыняў (praepositosaeternaliter) ці часовых кіраўнікоў (rectoresadtempo)» [6]. Ламбардскую абшчыну ўзначальвае «сабрат» (confrater) Ота з Рамецэла. Праз сто гадоў пасля яго смерці Бернард Гі пазначае: «вальдэнсы маюць і паставілі сабе адзінага галоўнага над сабой, якога называюць сваім Найвялікшым (Majoralem), якому ўсе падпарадкоўваюцца, як усе каталікі ў падпарадкаванні Уладару Папе» [9, p. 248]. Важныя звесткі ёсць у адным з Вроцлаўскіх манускрыптаў: для ўсёй нямецкамоўнай вальдэнскай зоны існаваў «глава ўсіх Апосталаў», т. зв. «самы галоўны» (supremus). У XIV ст. ім з’яўляўся Ганс з Польшчы, сын нямецкіх сялянаў, якія перасяліліся на польскія землі ў пачатку стагоддзя [15, S. 92]. Інквізітары дамініканец Антонія Сёмы з Савільяна і францысканец Тома дэ Казаска ў 1387–88 гг. запісалі ад вальдэнса Пінерола (Савойя), што «найвышэйшы пантыфік (summus Pontifex) паходзіць з яго секты і пражывае ў Апуліі» [16, S. 252]. Вядома, што згаданы вальдэнскі «Папа» даслаў свайго міністра Іаана Барыдона [16, S. 253].

У Рэскрыпце ёсць згадкі пра савет абшчыны, праўда, пра яго нічога канкрэтнага не гаворыцца, што не дазваляе выказаць якія-небудзь абгрунтаваныя меркаванні пра яго функцыі, склад, паўнамоцтвы і г. д. Магчыма, гэта быў галоўны орган, а сабрат выконваў толькі

адміністратыўныя функцыі [17, с. 133]. На падставе Рэскрыпта можна зрабіць выснову, што абшчына валодала таксама судовымі функцыямі: абвінавачаны брат Фама павінен быў перад ёй апраўдацца [5, S. 26].

У трактаце «Devita» ўтрымліваюцца найкаштоўнейшыя звесткі пра эканамічны аспект жыцця вальдэнскіх абшчын: «большасць грошай, на якія яны [французскія вальдэнсы] жылі, паходзіла з Германіі»; і іх унутраную арганізацыю – на кожным вальдэнскім сінодзе (capitulumgenerale) прысутнічалі тры ці чатыры нямецкія вальдэнсы [4, p. 201–202]. Падобныя звесткі даюць і акты Каркасонскай інквізіцыі: «Таксама збіраюць [ахвяраванні] з вернікаў і сяброў, і тое, што сабралі, перадаюць свайму галоўнаму (superiorem). Таксама, кожны год праводзяць адзін ці два усеагульныя сіноды» [16, S. 10]. У 1231 г. у Аналах горада Марбах паведамляецца, што нямецкія вальдэнсы кожны год высылалі ў Мілан «аброк» [18, S. 176]. Яшчэ больш звестак даюць матэрыялы інквізіцыйных допытаў Пятра Цвікера ў Памор'і ў канцы XIV ст.: арганізацыйна невялікая абшчына магла мець свайго скарбніка, які ў тым ліку збіраў грошы на «ўтрыманне» вандроўных вальдэнсаў [19, S. 17; 20, s. 64]. Невядома, ці скарбнік паходзіў абрад рукапалажэння, бо ў крыніцах няма звестак пра выкананне ім «магістарскіх» абавязкаў, за выключэннем хрышчэння дзяцей.

Гэтыя звесткі сугучныя інфармацыі з «Devita» пра «гаспіцыі» (гасцінныя дамы), дзе спыняліся вальдэнсы падчас вандровак. У кожнага з такіх дамоў быў свой кіраўнік, абавязкова з «магістраў» (бо здзяйсняў навучанне і бласлаўленне ежы, а таксама іншыя «святарскія» абавязкі), у тэрміналогіі крыніцы – рэктар [10, p. 180]. Варта падкрэсліць, што з'яўленне такіх «прамежкавых» ступеняў было магчыма толькі ў рэгіёнах, дзе «вернікі» пражывалі стала, працяглы час і вялікімі групамі. Храналагічна такое ўскладненне структуры адбылося прыкладна праз 100 гадоў пасля ўзнікнення руху.

***Царкоўныя саны сярод «дасканалых»***

Унутры «дасканалых» ідзе падзел на царкоўныя чыны: існуе епіскапат (біскуп мог называцца «галоўны» або «міністр»), прэсвітэрыят і дэканат [3, p. 51]. Пасвячэнне ў сан падрабязна апісана ў Рэскрыпце: у абшчыне «ламбардцаў» у выбары біскупаў прымалі ўдзел усе вернікі, «ліёнцы» ж аддавалі перавагу тым, хто падняўся да ступеняў дыяканаў і прэсвітэраў [21, p. 50–51]. У апісанні непасрэдна механізму сустракаюцца разначытанні:

- Каля 1266 г. у Італіі і Аўстрыі на аснове «Сумы пра катараў і леаністаў, або бедных з Ліёна» (1250 г.) былога ерэтыка Райнэрыя Саконі, які вярнуўся ў каталіцтва, былі створаны 2 трактаты. Пасаўскі ананім увогуле адвяргае наяўнасць працэдуры пасвячэння: «Пра таінства

пасвячэння кажуць, што гэта нішто, таму што Апосталы былі міранамі» [5, S. 89].

- І трактат Ансельма з Александрыі, які, наадварот, дае яе апісанне: «іх святары і біскуп уступаюць у сан праз накладанне рук» [10, p. 142].
- Аналагічны рытуал адзначае ў 1318 г. інквізітар Жан Фурнье ў Францыі [3, p. 6].
- Разгорнутае апісанне цырыманіялу пераходу чалавека з «вучнёўскага» стану да паўнавартасных прапаведнікаў (які ўключаў у сябе рукапалажэнне) апісаны інквізітарам Пятром Цвікерам, які дзейнічаў у шырокім рэгіёне ад Паморʼя да Аўстрыйскіх Альпаў, у 1391 г. [16, S. 367–69].

Але тэрміны, якія ўжывалі ў дачыненні да вальдэнсаў інквізітары (тыпу «біскуп» або «пантыфік»), на дадзены момант зʼяўляюцца спрэчнымі. Няма пацверджання ўжывання гэтага тэрміну самімі вальдэнсамі, нават калі гэтыя словы ўкладзены ў вусны дапытаных, як у спісе памылак пражскага магістра Якуба з Петрыкава ад 1395 г. «ёсць толькі тры царкоўныя чыны, а менавіта: свяшчэнства, епіскапат і дыяканат» [22, s. 181]. Магчыма, ідзе гаворка пра механічнае перанясенне структуры каталіцкай царквы.

***Высновы***

Напачатку вальдызму, як і ўсім ерэтычным рухам, быў уласцівы эгалітарызм [2, p. 94] і «свабода» па кантрасту з афіцыйнай царквой [23, p. 117]. Але з цягам часу структура абшчыны ўскладнілася, ад імітацыі Апосталаў вальдэнсы паступова, з сярэдзіны XIII ст., пераходзяць да арганізаванай пастырскай структуры [23, p. 126]. На пачатак XV ст. вальдэнскую абшчыну можна прадстваіць у выглядзе наступнай схемы:




*Структура вальдэнскай абшчыны*
*Structure of the community of Waldenses*

На дадзены момант адкрытымі застаюцца наступныя пытанні:

- Як праходзіў пераход унутры першай групы: як з простага прапаведніка стаць «Апосталам»? Як увайсці ў капітул?
- «Supremus» нямецкамоўнага рэгіёну і «найвышэйшы пантыфік» з Апуліі – гэта адзін і той жа чалавек ці розныя? Наколькі маналітным быў рух?

Адказы на гэтыя пытанні яшчэ чакаюць сваіх даследчыкаў. У наш час у бібліятэках адкрываюць новыя крыніцы, ідзе актыўная публікацыя вялікіх архіваў, удасканальваюцца метады гістарычнага пазнання. Усё гэта дае надзею на хуткае вырашэнне пазначаных загадак.

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. Валодзіна А. В. Станаўленне і развіццё руху вальдэнсаў у XII–XIV стст. Беларус. гіст. часоп. 2018. № 2. С. 19–27.

2. Stock B. The implications of literacy: written language and models of interpretation in the 11th and 12 centuries. Princeton, N. J.: Princeton Univ. Press.

3. Raymond de Sainte-Foy. Confession 3 [Electronic resource] // San Jose State University. Mode of access: http://www.sjsu.edu/people/nancy.stork/jacquesfournier/Raymond-de-Sainte-Foy-FINAL.pdf. Date of access: 20.08.2017.

4. De vita et actibus Pauperes de Lugduno // Bruschi C. Texts and the Repression of Medieval Heresy. York: Boydell&Brewer Ltd, 2003. P. 196–207.

5. Quellen zur Geschichte der Waldenser / Hrsg.: A. Patschkovsky, K.-V. Selge. Gütersloh: Mohn, 1973.

6. Валодзіна А. В. Рэскрыпт ерэсіярхаў Ламбардыі да леаністаў Алеманіі [Электронны рэсурс] // Scriptorium: история древнего мира и средних веков: электрон. студен. науч. журн. 2010. № 5. 1 электрон. опт. диск (CD-ROM).

7. Enchiridion fontium Valdensium: recueil critique des sources concernant les Vaudois au moyen âge: in 2 vol. / a cura di J. Gonnet. Torino: Claudiana, 1958. Vol. 1: Du IIIe Concile de Latran au Synode de Chanforan (1179–1532).

8. Wakefield W. L. Heresies of the High Middle Ages: sel. sources transl. a. annot. New York ; London: Columbia Univ. Press, 1969.

9. Bernardus Guidonis. Practica inquisitonis haeretica pravitatis; publié par C. Douais. Paris: Alphonse Picard, 1886.

10. Enchiridion fontium Valdensium: recueil critique des sources concernant les Vaudois au moyen âge: in 2 vol. / a cura di J. Gonnet. Torino: Claudiana, 1998. Vol. 2: De la fin du XIIe au début du XIVe siècle.

11. Hoose A.L. The Sabatati: The Significance of Early Waldensian Shoes, c. 1184–c. 1300 // Speculum. Volume 91, Number 2 (April 2016). P. 356–373.

12. Powell J. M. Religious diversity and communal politics in thirteenth-century Italy // Portraits of medieval and renaissance living: essays in memory of D. Herlihy / ed.: S. K. Cohn, S. A. Epstein, D. Herlihy. Ann Arbor, 1996. P. 363–381.

13. Grundmann H. Religious movements in the Middle Ages: the historical links between heresy, the mendicant orders, and the women's religious movement in the twelfth and thirteenth century, with the historical foundations of German mysticism. Notre Dame: University of Notre Dame Press, 2005.

14. Heresy and literacy, 1000–1530 / ed.: P. Biller, A. Hudson. Cambridge, 1996.

15. Szymański J. Articuli secte Waldensium na tle antyheretyckich zbiorów rękopiśmiennych Biblioteki Uniwersytetu Wrocławskiego // Studia Źródłoznawcze / Pol. Akad. Nauk, Inst. Historii. Warszawa, 2004. T. 42. S. 85–96.

16. Döllinger I. von. Beiträge zur Sektengeschichte des Mittelalters. München: Beck, 1890.

17. Карсавин Л. Сочинения: [в 2 т.]. СПб.: Алстейя, 1997. Т. 2: Основы средневековой религиозности в XII–XIII веках.

18. Annales Marbacenses a. 631–1375 / ed. R. Wilmans // Monumenta Germaniae Historica. Scriptorum. 1861. T. 17. S. 142–180.

19. Rymar E. Waldensi z «kacerskich» okolic Chojny w XIV–XVwieku // Rocz. Chojenski. Pismo Hist.-Spoleczne / Stow. Hist.-Kulturalne «Terra incognita». Chojna, 2009. Vol. 1. S. 7–33.

20. Szymański J. W. Waldensi. Kielce: Oficyna Wydawnicza "Ston 2".

21. Gonnet G. Il valdismo medioevale: prolegomeni. Torre Pellice: Soc. di Studi Valdesi, 1942.

22. Holinka R. Sektářství v Čechách před revolucí husitskou // Sb. Filos.ofické Fakulty Univ. Komenského. Bratislava, 1929. Roč. 6, № 3. S. 34–181.

23. Bruschi C. The wandering heretics of Languedoc. Cambridge etc.: Cambridge University Press, 2009.